выкладчыка (як у галіне павышэння кваліфікацыі, так і забеспячэння сучаснымі сродкамі навучання) павінна быць адказнасць за будучыню прафесіі і маладога пакалення, за будучыню развіцця нашага грамадства.


*1.* Активные формы обучения в преподовании управленческих дисциплин : метод. пособие / под ред. А. И. Андрющенко. – Харьков : Харьковский нац. ун-т, 2003. – 191 с.

*2. Акулич, В. А.* К вопросу о методике преподавания курса “Всемирная история библиотечного дела в Белорусском университете культуры” / В. А. Акулич // Библиотечное дело на пороге XXI века : тез. докл. и сообщ. междунар. науч. конф. (Москва, 15–16 апр. 1998 г.) : в 2 ч. : Ч. 2. – М., 1998. – С. 71–73.

*3. Кринчик, Е. П.* К вопросу об активных формах обучения в профессиональной подготовке психологов [Электронный ресурс] / Е. П. Кринчик [Электронный ресурс]. – Режим доступа: htth://flogiston.ru/articles/labour/krinchik_msu_podgotovka.

*4. Луговой, А. А.* Использование активных форм обучения на семинаре по культурологии [Электронный ресурс] / А. А. Луговой // Формирование дисциплинарного пространства культурологии : материалы науч.-метод. конф., 16 января 2001 года, Санкт-Петербург. – СПб. : Санкт-Петербургское философское общество, 2001. – Вып. 11. – С. 75–76. – (Symposium). – Режим доступа: http://anthropology.ru/ru/texts/lugovoi/culturology_18.html.

*5. Озмидова, Е. В.* Мотивационные аспекты педагогического взаимодействия в Вузе / Е. В. Озмидова // Новые педагогические исследования: альманах: прил. к журн. «Проф. образование». – М., 2007. – № 3. – С. 59–65.

*6. Роджерс, К.* Свобода учиться: пер. с англ. / К. Роджерс, Д. Фрейберг. – М. : Смысл, 2002. – 527 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ


**С. В. Зыгмантовіч,** *загадчык кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы, кандыдат педагагічных навук, дацэнт, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў*


# МАТЫВАЦЫЯ ВЫБАРУ ПРАФЕСІІ БІБЛІЯТЭКАРА ЯК АБ’ЕКТ МАНІТОРЫНГАВАГА ДАСЛЕДАВАННЯ

Сярод актуальных праблем прафесійнай падрыхтоўкі бібліятэчных спецыялістаў выступаюць пытанні, звязаныя з матыва-

мі выбару і прафесійнага станаўлення кадраў бібліятэчна-інфармацыйных спецыяльнасцей. У сучасных умовах зніжэння статусу бібліятэкі як сацыяльнага інстытута, змяншэння цікавасці да прафесіі бібліятэкара для ўстаноў вышэйшай адукацыі (УВА) – гэта пытанні колькасці і якасці абітурыентаў, напаўняльнасці аўдыторый студэнтамі і прагнозы на паспяховасць іх навучання, а таксама неабходнасці пошуку новых тэхналогій прафесійнага развіцця і станаўлення асобы будучага спецыяліста, якія павінны быць арыентаваны на пастаянна зменлівы рынак працы, магчымасці прафесійнай мабільнасці і канкурэнтаздольнасці выпускнікоў. Актуальнасць вывучэння ўказаных праблем павышаецца ў кантэксце функцыянавання ў адукацыйных установах сістэм менеджменту якасці, арыентаваных на задавальненне чаканняў і патрэбнасцяў спажыўцоў сваіх адукацыйных паслуг. А каб іх якасна задавальняць – трэба ведаць сваіх спажыўцоў.

Хто ж наш студэнт, з якімі матывамі ён прыходзіць ва ўніверсітэт, што прапаноўвае адну з адукацыйных праграм па спецыяльнасці «бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць»?

У Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў (БДУКМ) ужо не адзін год (з 2011 г.) працуе аддзел менеджменту якасці адукацыі. Адным з кірункаў дзейнасці аддзела з’яўляецца правядзенне маніторынгавых даследаванняў на ўваходзе і выхадзе такога асноўнага працэсу, як навучанне студэнтаў на першай ступені атрымання адукацыі, так званы спажывецкі маніторынг. Акрамя таго, на факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый таксама пастаянна праводзіцца маніторынгавае даследаванне з мэтай высвятлення матывацыі выбару прафесіі бібліятэкара-бібліёграфа і пашырэння пазнання асобы нашага студэнта, удасканалення форм і метадаў прафарыентацыйнай, вучэбна-выхаваўчай работы [1; 2]. Выкарыстоўваемы метад даследаванняў, што праводзяца, як правіла, суцэльнае анкетаванне абітурыентаў і студэнтаў.

Па выніках даследавання аддзела менеджменту якасці адукацыі, абітурыенты, якія вырашылі паступаць на факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый (ФІДК) у 2014 г., свае матывы атрымання вышэйшай адукацыі звязваюць з наступнымі патрэбнасцямі. Больш паловы абітурыентаў – 55 % – лічаць, што вышэйшая адукацыя дасць ім магчымасць стаць культурным, высокаадукаваным чалавекам; кожны трэці (33 %) звязвае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паступленне ва ўніверсітэт з павышэннем свайго сацыяльнага статусу. Гэтыя матывы можна аднесці да вытворчых, развіваючых. Палова абітурыентаў звязвае сваё паступленне з утылітарнымі, спажывецкімі матывамі – атрыманнем дыплома аб вышэйшай адукацыі (50 % апытаных выбралі адказ «лічу, што дыплом аб вышэйшай адукацыі (без розніцы які) спатрэбіцца ў жыцці»). Да гэтага ж віду матывацыі трэба аднесці і адказы: «на атрыманні вышэйшай адукацыі настаялі блізкія родзічы» (15 %); «думаю працягнуць гады навучання як гады адносна бесклапотнага існавання» (9 %). І толькі кожны трэці ў якасці дамінантнай матывацыі адзначыў, што хоча стаць высокакваліфікаваным спецыялістам – 33 % удзельнікаў апытання.

Матывы выбару менавіта БДУКМ для навучання звязаны з эканамічнымі аспектамі, магчымасцямі навучацца на бюджэтнай аснове – для 37 % апытаных, конкурснай сітуацыяй – для 11 %, прэстыжнасцю ўніверсітэта – для 17 %, і, у той самы час, з выбранай спецыяльнасцю і з якасцю адукацыі – адпаведна для 13 і 8 %.

Калі пабудаваць ранжыраваны рад чаканняў абітурыентаў ад вучобы ва ўніверсітэце, то можна адзначыць, што ўсе яны важкія для прафесіі бібліятэкара: з магчымасцю атрымання высокай агульнакультурнай падрыхтоўкі свае чаканні звязваюць 55 % апытаных, з магчымасцю авалодання замежнай мовай на высокім узроўні – 31 %, уменнем самастойна папаўняць веды – 30 %; з развіццём навыкаў работы з камп'ютарам – 21 %. Разам з тым, асэнсаванне значнасці прафесійнай падрыхтоўкі ва ўніверсітэце адзначана толькі паловай абітурыентаў: атрыманнем неабходнага ўзроўню практычнай падрыхтоўкі па спецыяльнасці – 48 %, атрыманнем неабходнага ўзроўню тэарэтычнай падрыхтоўкі па спецыяльнасці – 30 %.

Праведзенае анкетаванне першакурснікаў-бібліятэкараў, пасутнасці, пацвердзіла папярэднія вынікі даследавання аддзела менеджменту якасці адукацыі. Сярод удзельнікаў анкетавання на ФІДК на прамое пытанне, наколькі свядома і мэтанакіравана абрана прафесія бібліятэкара-бібліёграфа, – 57 % адказалі станоўча, што мэтанакіравана (у 2013 г. – 56,9 %), 29 % – выпадкова (у 2013 г. – 28 %), па патрабаванні бацькоў – 9 % (у 2013 г. – 7,5 %) , па прыкладу сяброў – 5 % (у 2013 г. – 3,8 %). Трэба адзначыць, што такая сітуацыя па выніках анкетавання захоўваецца на працягу некалькіх апошніх гадоў.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Аналіз матываў, якія ўплываюць на выбар менавіта бібліятэчнай прафесіі першакурснікамі ФІДК, дазваляе вызначыць іх значнасць (*гл. табл.*).

*Табліца*

**Матывы, абраныя студэнтамі як значныя пры выбары прафесіі бібліятэкара-бібліёграфа**

| № | Матывы выбару прафесіі бібліятэкара | % |
|---|---|---|
| 1. | Прываблівае праца з новай інфармацыяй, літаратурай | 14 % |
| 2. | Дазваляе ўдасканальваць свой духоўны свет | 12,5 % |
| 3. | Прываблiваюць зносіны з рознымі людзьмі | 11, 6% |
| 4. | Дае магчымасць прыносіць карысць людзям, грамадству | 8,7 % |
| 5. | Забяспечае паступленне і навучанне ва УВА | 8,4 % |
| 6. | Дазваляе мець зносіны з духоўна багатымі людзьмі | 6,6 % |
| 7. | Дазваляе працаваць у калектыве, удзельнічаць у яго справах | 5,9 % |
| 8. | Дае вялікія магчымасці для творчасці | 5,6 % |
| 9. | Упэўненасць, што абараная прафесія адпавядае маім здольнасцям | 4,7 % |
| 10. | Прываблівае прафесія, якая патрабуе пастаяннага развіцця, навучання | 4,7 % |
| 11. | Дае магчамасць працаваць у горадзе | 3,4 % |
| 12. | Дазваляе адчуваць радасць працы | 2,8 % |
| 13. | Дазваляе праяўляць індывідуальнасць у працы | 2,5 % |
| 14. | Забяспечвае хуткае павышэнне кваліфікацыі і прафесійны рост | 2,2 % |
| 15. | Забяспечвае стабільную будучыню | 1,9 % |
| 16. | Перакананне, што прафесія мае высокі прэстыж у грамадстве | 1,6 % |
| 17. | Цікавасць да матэрыяльнага боку прафесійнай дзейнасці | 0,9 % |
| 18. | Шануецца сярод сяброў і знаёмых | 0,6 % |
| 19. | Іншае (няма матываў) | 1,6 % |

Калі аб'яднаць матывы, звязаныя са схільнасцямі да бібліятэчнай дзейнасці, звычайна гэта звязана з цікавасцю да інфармацыі і зносін з людзьмі, то можна заўважыць, што іх доля ў агульнай структуры матываў вылучае іх на першыя пазіцыі, але не з'яўляецца пераканальна высокай. У той самы час з вынікаў анкетавання можна ўбачыць, што для студэнцтва характэрна адсутнасць пераважнага матыву (адсоткавыя суадносіны меркаванняў не маюць высокай разбежкі). Даволі значнымі з'явіліся і ўтылітарныя матывы выбару прафесіі (меркаванні 5, 11, 15, 17 – сумарныя адсоткі склалі па гэтых пазіцыях 14,6 %).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А такі ўнутраны матыў, як упэўненасць, што абраная прафесія адпавядае здольнасцям, складае ўсяго 4,7 %.

Як мы бачым з прыведзеных выніках даследванняў, на сучасным этапе цікавасць да вышэйшай адукацыі сярод моладзі, у тым ліку і ў сферы інфармацыйна-бібліятэчнай адукацыі, не змяняецца і, на жаль, мае пераважна прагматычную аснову і вымушае шукаць эфектыўныя падыходы да фарміравання вучэбна-прафесійнай матывацыі і прафесійнай накіраванасці будучых спецыялістаў ва ўмовах вучэбна-выхаваўчага працэсу ва УВА.

У кантэксце ўказаных палажэнняў уяўляецца неабходным засяродзіць увагу на двух аспектах, па-першае, што менавіта перад выкладчыкамі факультэта стаіць задача правядзення ўнутрыўніверсітэцкай прафесійнай арыентацыі; а па-другое, актуальным з’яўляецца выяўленне педагагічна найбольш мэтазгодных падыходаў да арганізацыі прафесійнай самаідэнтыфікацыі будучых бібліятэкараў на працягу падрыхтоўкі ў навучальнай установе.

Значную ролю ў рэалізацыі гэтых форм адаптацыі адыгрывае курс «Уводзіны ў спецыяльнасць», прафесійна-выхаваўчая накіраванасць выкладання спецыяльных дысцыплін як на змястоўным, так і працэсуальным узроўнях, выхаваўчая работа кuратараў, спецыяльных кафедр са студэнтамі, замацаваных за ёю спецыялізацый. Лагічным было б увядзенне ў якасці курсаў на выбар і такіх курсаў, як «Бібліятэчная прафесіялогія», «Прафесійная культура бібліятэкара», «Імідж бібліятэкара», «Этыка бібліятэкара», «Камунікатыўная культура бібліятэкара» і інш.

Адначасова з набыццём ведаў аб вобразе прафесіянала неабходна забяспечыць яго напаўненне асаблівым сэнсам, эмацыянальнымі адносінамі, спалучыць з назапашаным вопытам суб’екта, што з’яўляецца базай для цэласнага ўяўлення свайго прафесійнага шляху кожным студэнтам, калі грамадскае і асабістае выступаюць як узаемазвязаныя і ўзаемастымулюючыя кампаненты, і з’яўляюцца асновай фарміравання вобраза «Я-прафесіянал».

Напрамкамі фарміравання вобраза прафесіянала як умовы для ажыццяўлення самаідэнтыфікацыі студэнтаў сёння на факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый БДУКМ выступаюць педагагічна мэтанакіраваныя падыходы, прыёмы і метады: асабова-дзейнасны падыход да арганізацыі вучэбна-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выхаваўчага працэсу; праектны метад навучання; выкарыстанне актыўных форм навучання (дзелавыя гульні, вырашэнне вытворчых, сітуацыйных задач, публічная абарона падрыхтаваных праектаў і інш.), а таксама форм вучэбнай дзейнасці, арыентаваных на калектыўную (камандную) падрыхтоўку і абмеркаванне, якія дазваляюць комплексна развіваць пазнавальны, эмацыянальны, волевы, матывацыйны кампаненты псіхічнай сферы студэнтаў; практыка-арыентаваная тэматыка розных відаў заданняў, падрыхтоўка праектаў, курсавых, дыпломных работ па заказах бібліятэк і выкарыстанне вынікаў вучэбнай дзейнасці ў практыцы работы бібліятэк краіны; правядзенне заняткаў на базе лепшых бібліятэк краіны ў межах функцыянавання вучэбна-навукова-вытворчых комплексаў; падрыхтоўка студэнтамі эсэ, прэзентацый аб бібліятэчнай прафесіі, паслугах бібліятэк, рэкламнай інфармацыі аб бібліятэках, бібліятэкарах для СМІ, удзел у прафарыентацыйнай рабоце; сустрэчы з вядучымі спецыялістамі бібліятэчнай сферы як нашай краіны, так і замежных; правядзенне выхаваўчых, культурна-масавых, адукацыйных мерапрыемстваў студэнтамі-старшакурснікамі для студэнтаў першага курса («Прысвячэнне ў студэнты», «Першаліст», «Дзень факультэта»), навучэнцаў школ г. Мінска і інш.

Усё гэта дае свой плён. Адным з напрамкаў маніторынгавых даследаванняў аддзела менеджменту якасці з'яўляецца вывучэнне ступені задаволенасці працэсам навучання ва ўніверсітэце. Атрыманыя даныя сведчаць, што выпускнікі ФІДК даволі высока ацэньваюць якасць адукацыі на факультэце, хаця не ўсе ўмовы навучальнай дзейнасці іх задавальняюць. Задаволенасць аб'ёмам і якасцю ведаў, атрыманых на аўдыторных занятках па дысцыплінах сацыяльна-гуманітарнага цыклу складае – 72,1 %. Больш высокая задаволенасць аб'ёмам і якасцю ведаў, атрыманых на аўдыторных занятках па дысцыплінах агульнапрафесійнага і спецыяльнага цыклаў – 76,8 %. Задаволенасць узроўнем перадачы ведаў (выкарыстаннем разнастайных методык, аўдыявізуальных сродкаў навучання) – 58,1 %. Задаволенасць якасцю вытворчай практыкі – 67,4 %. Задаволенасць узроўнем далучэння да навукова-даследчай дзейнасці (навуковыя канферэнцыі, публікацыя навуковых матэрыялаў, конкурсы і г. д.) – 65,1 %.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Разам з тым, у кантэксце разглядаемай тэмы не могуць не выклікаць цікавасць наступныя даныя: па выніках даследаванняў аддзела менеджменту якасці адукацыі на ФІДК стаў зніжацца працэнт задаволенасці выпускнікамі атрымоўваемай спецыяльнасцю. Так, у 2010 г. па выніках апытання выпускнікоў мы бачылі станоўчую дынаміку змянення задаволенасці выпускнікоў і маладых спецыялістаў абранай спецыяльнасцю і выніковасць нашай работы па фарміраванні прафесійнай накіраванасці будучых спецыялістаў: у 65,8 % рэспандэнтаў уяўленні аб уласнай спецыяльнасці на працягу вучобы змяніліся ў лепшы бок, уласны выбар палічылі сапраўдным 65,5 %; працягваць работу па спецыяльнасці планавала 60 % маладых спецыялістаў [2]. Аднак ужо ў 2012 г. на пытанне «Ці абралі б вы зноў тую ж самую спецыяльнасць?» станоўча адказалі сярод выпускнікоў – 28,6 %, у 2013 г. – 12,7 %, у 2014 г. – 27,9 %. Прычыны такога становішча, безумоўна, звязаны з крызіснымі з'явамі ў бібліятэчнай сферы нашай краіны, зніжэннем прэстыжу прафесій, якія адносяцца да бюджэтнай сферы, нізкімі заробкамі, сацыяльнай неабароненасцю (у параўнанні, напрыклад, з педагогамі, медыцынскімі работнікамі), чарговай хваляй аптымізацыі ў дачыненні да кадраў сферы культуры і саміх бібліятэк, дрэннай забяспечанасцю матэрыяльна-тэхнічнай і рэсурснай базы бібліятэк. За матывацыяй выбару і паводзін заўжды стаіць сацыяльны вопыт асобы ва ўсёй паўнаце, а ў працэсе навучання ён якраз і ўзбагачаецца. Існуючыя праблемы ў галіне абыходзіць не можам не мы, выкладчыкі, не супрацоўнікі бібліятэк, дзе праходзіць практыка або працуюць нашы студэнты. І ўжо падчас навучання сутыкненне і асэнсаванне гэтых праблем прыводзіць да пэўнага расчаравання моладзі.

Але, безумоўна, гэта знешнія прычыны: сама праблема патрабуе больш глыбокага вывучэння. Відавочна, што ў кола праблем, звязаных з вывучэннем стаўлення студэнтаў да абранай прафесіі, павінен быць уключаны шэраг пытанняў. Гэта і дынаміка задаволенасці прафесіяй ад курса да курса; фактары, якія ўплываюць на фарміраванне задаволенасці: сацыяльна-псіхалагічныя, псіхолага-педагагічныя, дыферэнцыяльна-псіхалагічныя, у тым ліку і полаўзроставыя; праблемы прафесійнай матывацыі, або, іншымі словамі, сістэма і іерархія матываў, якія вызначаюць пазітыўнае або негатыўнае стаўленне да абранай прафесіі. Па-за полем зроку даследаванняў застаецца матыва-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыя адыходу з прафесіі, з факультэта, матывацыя адлічэння студэнтаў па ўласным жаданні.

Пошук новых падыходаў, форм, метадаў арганізацыі вучэбнага, выхаваўчага працэсу на факультэце, арыентаванага на развіццё духоўна-светапогляднай, камунікатыўнай і прафесійнай самаідэнтыфікацыі бібліятэчных спецыялістаў, працягвае заставацца актуальнай і педагагічна значнай задачай. Па-сутнасці мы прайграём на ўласным полі: мы актывізавалі прафарыентацыйную работу, вядзём яе як кантактную, мэтанакіраваную, і, у той самы час, губляем як будучых спецыялістаў нашых студэнтаў.

Перад выкладчыкамі ФІДК стаіць задача высокай грамадскай значнасці: фарміраванне, развіццё станоўчай прафесійнай матывацыі маладых спецыялістаў, ад дзейнасці якіх шмат у чым будзе залежыць бібліятэчны ланшафт будучага. Маніторынгавыя ж даследаванні ў гэтай сферы дазваляюць вызначыць праблемы, асэнсаваць іх, своечасова прыняць арганізацыйна-упраўленчыя рашэнні, накіраваныя на іх вырашэнне.

---


*1. Зыгмантович, С. В.* Мотивация выбора профессии библиотекаря и профориентационная работа / С. В. Зыгмантович // Библиотечное дело – 2004: всеобщая доступность информации: материалы 9-й Междунар. науч. конф. (Москва, 22–24 апреля 2004 г.). – М., 2004. – С. 47– 49.

*2. Зыгмантовіч, С. В.* Матывацыя бібліятэчнай дзейнасці ў структуры прафесійнага самавызначэння будучых спецыялістаў / С. В. Зыгмантовіч, А. Ю. Казленка // Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. – 2011. – № 2 (16). – С. 94–101.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ